ААВЛ

Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

*Установа адукацыі*
«Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт
імя Максіма Танка»

***А.А. Корзюк***

# ВЫВУЧЭННЕ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ КАНЦА XVIII – ПАЧАТКУ XX ст. У АГУЛЬНААДУКАЦЫЙНАЙ ШКОЛЕ

Репозиторий БГПУ

Рэкамендавана Вучэбна-метадычным аб'яднаннем
вышэйшых навучальных устаноў Рэспублікі Беларусь па педагагічнай
адукацыі ў якасці вучэбна-метадычнага дапаможніка для студэнтаў
вышэйшых навучальных устаноў, якія навучаюцца па спецыяльнасцях:
1-020101 Гісторыя; 1-020102 Гісторыя. Дадатковая спецыяльнасць

Мінск 2010

БГПУ БИБЛИОТЕКА
ИНВ. № УК 4721

25. Вяземский Е.Е., Стрелова О.Ю. Материалы курса «Как преподавать историю в современной школе: теория и методика»: лекции 5–8. М., 2006.
26. Чернова М.Н. Урок – лабораторное занятие «Законы царя Хаммурапи», 5 класс // Настольная книга учителя истории: 5–11 классы / авт.-сост. М.Н. Чернова. М., 2006.
27. Корзюк, А.А. Формирование устойчивого познавательного интереса учащихся в процессе изучения истории Беларуси в 7–8 классах: автореф. дис. ... канд. пед. наук: 13.00.02 / Бел. гос. пед. ун-т. – Минск, 2009.
28. Скаткин М.Н. Совершенствование процесса обучения. М., 1971.
29. Корзюк А. Міжпрадметныя і ўнутрыпрадметныя сувязі пры вывучэнні гісторыі Беларусі канца XVIII – пачатку XX ст. // Бел. гіст. часопіс. 2010. № 2.



ГЛАВА 3

# МЕТАДЫЧНЫЯ РЭКАМЕНДАЦЫІ ПА ВЫВУЧЭННІ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ КАНЦА XVIII – ПАЧАТКУ XX ст. НА ЎРОКАХ У IX КЛАСЕ

Перад тым, як прыступіць да разгляду метадычных парад да вывучэння найбольш значных і складаных тэм курса гісторыі Беларусі ў IX класе, адзначым сродкі навучання, якія настаўніку мэтазгодна выкарыстоўваць пры правядзенні ўрокаў па прадмеце.

Пры вывучэнні ўсіх тэм у якасці ***асноўных сродкаў навучання*** выкарыстоўваюцца тэкст вучэбнага дапаможніка, яго метадычны апарат і ілюстрацыйны матэрыял; картаграфічныя матэрыялы (атласы, гістарычныя карты, якія маюцца ў наяўнасці ў кабінеце гісторыі); хрэстаматыі [1–4]; кніга для чытання [5–6]. Акрамя гэтага, настаўнік можа выкарыстоўваць дапаможнікі для арганізацыі самастойнай работы вучняў (рабочыя сшыткі, практыкумы, зборнікі тэстаў і г. д.) і контурныя карты. Электронныя і аўдыевізуальныя сродкі навучання гісторыі Беларусі канца XVIII – пачатку XX ст. выкарыстоўваюцца з улікам іх наяўнасці і матэрыяльна-тэхнічных магчымасцей агульнаадукацыйнай установы. Пры гэтым падкрэслім, што толькі рацыянальнае спалучэнне традыцыйных і інавацыйных сродкаў навучання гісторыі ў стане даць найбольшы адукацыйны эфект ад іх прымянення.

Інтэграцыя сродкаў інфармацыйных тэхналогій у адукацыйны працэс мае сваёй перадумовай прымяненне камп'ютара, які выступае як эфектыўны сродак падтрымкі вучэння школьнікаў. Гэта магчыма і мэтазгодна як на этапе праектавання навучальнага працэсу, так і пры яго ажыццяўленні. Пры стварэнні праекта вывучэння новай тэмы настаўнік можа выкарыстоўваць камп'ютар у якасці [7, с. 70–71]:

а) крыніцы інфармацыі, звязанай з найноўшымі навуковымі адкрыццямі і тэхнічнымі дасягненнямі (у гэтым выпадку пажадана падключэнне камп'ютэра да сеткі «Інтэрнэт»);

б) прыстасавання, з дапамогай якога можна прагледзець і адабраць для вучэбных заняткаў камп'ютарныя дэманстрацыі з'яў і працэсаў (гэта магчыма пры наяўнасці CD-ROM і неабходнага праграмнага забеспячэння);



Репозиторий БГТУ